**РЭЗАЛЮЦЫЯ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ БЕЛАРУСІ**
**да Канферэнцыі «Новая Беларусь» 2026**

# АБ ПРЫЯРЫТЭТАХ БЕЛАРУСКА-ЎКРАІНСКАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

8–9 жніўня, Варшава

**Мы, прадстаўнікі і прадстаўніцы дэмакратычных сіл Беларусі**,

падтрымліваючы суверэнітэт, тэрытарыяльную цэласнасць і права Украіны на самаабарону ад расійскай агрэсіі ў адпаведнасці з міжнародным правам;

падкрэсліваючы, што рэжым нясе поўную адказнасць за саўдзел у расійска-украінскай вайне і прадстаўленне тэрыторыі для злачыннай агрэсіі супраць Украіны;

прызнаючы, што Беларусь і Украіна звязаныя геаграфічнай блізкасцю, гістарычным досведам і агульнымі інтарэсамі бяспекі;

адзначаючы ўклад беларускіх добраахвотнікаў, валанцёраў, актывістаў і дыяспаральных супольнасцяў у падтрымку Украіны, а таксама падтрымку, якую Украіна аказвае беларусам, вымушаным пакінуць краіну праз рэпрэсіі;

вітаючы развіццё палітычнага, парламенцкага і грамадскага дыялогу паміж Украінай і беларускімі дэмакратычнымі сіламі, стварэнне механізмаў каардынацыі, дзейнасць міжфракцыйнага аб’яднання «За дэмакратычную Беларусь», адкрыццё Місіі дэмакратычных сіл у Кіеве і ўклад беларускай супольнасці ва Украіне;

**прымаем гэтую рэзалюцыю:**

1. **Пацвярджаем падтрымку** права Украіны на самаабарону і аднаўленне яе тэрытарыяльнай цэласнасці ў міжнародна прызнаных межах.
2. **Асуджаем** выкарыстанне тэрыторыі, інфраструктуры і рэсурсаў Беларусі для расійскай агрэсіі супраць Украіны і лічым аднаўленне поўнага суверэнітэту Беларусі неабходнай умовай бяспекі абедзвюх дзяржаў.

## ВЫЗНАЧАЕМ НАСТУПНЫЯ ПРЫЯРЫТЭТЫ СУПРАЦОЎНІЦТВА

1. **Бяспека і суверэнітэт.** Каардынацыя дзеянняў для недапушчэння выкарыстання тэрыторыі Беларусі ў агрэсіі супраць Украіны, супрацьдзеянне вярбоўцы беларусаў у расійскія ўзброеныя фарміраванні і гібрыдным пагрозам. Падрыхтоўка асноў будучага супрацоўніцтва ў сферы аховы мяжы, абмену інфармацыяй і рэгіянальнай бяспекі.

2. **Адказнасць і мэтавы ціск.** Каардынацыя міжнародных намаганняў для дакументавання злачынстваў, прыцягнення да адказнасці асоб, датычных да саўдзелу ў расійскай агрэсіі і незаконнага перамяшчэння ўкраінскіх дзяцей, а таксама прымянення мэтавых санкцый да адказных асоб і структур.
3. **Правы і падтрымка беларусаў ва Украіне.** Устойлівыя рашэнні ў пытаннях прававога статусу, дакументаў і мабільнасці беларусаў, а таксама прававая, медыцынская і сацыяльная падтрымка беларускіх добраахвотнікаў, ветэранаў і іх сем'яў.
4. **Палітычнае, парламенцкае і міжнароднае супрацоўніцтва.** Развіццё ўзаемадзеяння паміж беларускімі дэмакратычнымі інстытутамі, Вярхоўнай Радай і іншымі дзяржаўнымі інстытутамі Украіны, каардынацыя пазіцый і сумесная праца ў міжнародных арганізацыях і парламенцкіх асамблеях.
5. **Стратэгічныя камунікацыі.** Сумесныя аналітычныя, экспертныя і медыйныя праекты для супрацьдзеяння расійскай прапагандзе, дэзынфармацыі і спробам адмаўлення беларускай і ўкраінскай нацыянальнай суб'ектнасці.
6. **Адукацыя, культура і гістарычная памяць.** Падтрымка беларуска-ўкраінскіх культурных і адукацыйных праектаў, вывучэння беларускай і ўкраінскай моў, акадэмічнай мабільнасці, прызнання дакументаў аб адукацыі, стыпендыяльных і даследчых праграм, а таксама сумеснага асэнсавання гістарычнага досведу.
7. **Аднаўленне і эканамічнае супрацоўніцтва.** Удзел беларускага экспертнага, прафесійнага і прадпрымальніцкага асяроддзя ў праектах аднаўлення Украіны і падрыхтоўка ўзаемавыгаднага эканамічнага супрацоўніцтва пасля дэмакратычных перамен у Беларусі.

## ЗАКЛІКАЕМ КІРАЎНІЦТВА І ДЗЯРЖАЎНЫЯ ІНСТЫТУТЫ УКРАІНЫ

- развіваць сістэмны дыялог з беларускімі дэмакратычнымі інстытутамі і грамадзянскай супольнасцю па пытаннях бяспекі, падтрымкі Украіны, будучага дэмакратычнага пераходу ў Беларусі і пасляваеннага аднаўлення;
- стварыць устойлівыя механізмы палітычнага і экспертнага дыялогу, якія дазволяць развіваць супрацоўніцтва па-за межамі бягучага ваеннага кантэксту з улікам інтарэсаў і прыярытэтаў абодвух бакоў;
- распрацаваць устойлівыя рашэнні для прававога статусу, дакументаў і мабільнасці беларусаў, якія пражываюць ва Украіне, уключаючы валанцёраў і членаў сем'яў украінскіх вайскоўцаў, а таксама забяспечыць прававыя і сацыяльныя гарантыі беларускім добраахвотнікам і сем'ям загінулых, параненых, зніклых без вестак і палонных.

## ІНСТЫТУТЫ БЕЛАРУСКІХ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ БЯРУЦЬ НА СЯБЕ АБАВЯЗКІ

- каардынаваць з украінскімі партнёрамі пазіцыі і дзеянні ў сферах бяспекі, мэтавых санкцый і прасоўвання супольных пазіцый на міжнародным узроўні ў межах сваіх мандатаў і кампетэнцый;
- садзейнічаць дакументаванню злачынстваў і прыцягненню да адказнасці асоб, датычнасць якіх будзе ўстаноўленая кампетэнтнымі нацыянальнымі або міжнароднымі органамі;

- падтрымліваць права Украіны на самаабарону і аднаўленне яе тэрытарыяльнай цэласнасці ў міжнародна прызнаных межах;
- сумесна супрацьдзейнічаць расійскай прапагандзе, дэзынфармацыі і іншым гібрыдным пагрозам для Беларусі і Украіны;
- дамагацца спынення расійскага ваенна-палітычнага кантролю над Беларуссю, вываду расійскіх войскаў, расійскіх ваенных аб’ектаў і ядзернай зброі і аднаўлення поўнага суверэнітэту краіны.

**Супрацоўніцтва суверэннай дэмакратычнай Беларусі і Украіны павінна стаць важным элементам бяспекі ва Усходняй Еўропе. Яно павінна грунтавацца на суверэннай роўнасці, узаемнай павазе, добрасуседстве, еўрапейскім выбары і недапушчэнні выкарыстання тэрыторыі адной дзяржавы для агрэсіі супраць другой.**

*Офіс Святланы Ціханоўскай,*
*Аб’яднаны Пераходны Кабінет,*
*Каардынацыйная Рада,*
*Платформа палітычных партый*